**МЕЗЕНКА ГАННА МІХАЙЛАЎНА** (н. 06.03.1948, в. Альбянка Нясвіжскага р-на Мінскай вобл.), беларускі лінгвіст і педагог. Адзін з найбольш аўтарытэтных айчынных вучоных у галіне анамастыкі. Заснавальнік віцебскай анамастычнай навуковай школы. Доктар філалалагічных навук (1991), прафесар (1993). Закончыла літаратурна-музычны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.М.Горкага па спецыяльнасці “Руская мова, літаратура і спевы” (1971), аспірантуру пры кафедры агульнага мовазнаўства і сучаснай рускай мовы МДПІ (1974), дактарантуру пры кафедры рускай мовы БДУ (1991). З 1974 г. працавала ў Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П.М.Машэрава на пасадзе старшага выкладчыка (да 1977) і дацэнта (да 1988). З 1993 г. – загадчык кафедры агульнага і рускага мовазнаўства ВДУ. Кіраўнік шэрагу навуковых праектаў, у тым ліку тэмы “Віцебшчына і Смаленшчына ў моўных, літаратурных і культурных кантактах”. Кандыдацкая дысертацыя прысвечана вывучэнню дзеясловаў з элементам *-ір-* у сучаснай рускай і беларускай мовах, доктарская – урбананіміі Беларусі. Аўтар каля 300 навуковых работ па розных галінах беларускага і рускага мовазнаўства, сярод якіх шэраг арыгінальных слоўнікаў, манаграфій, вучэбных дапаможнікаў. Спецыяліст у галіне анамастыкі, дэрываталогіі, лексікаграфіі, тэорыі мовы, дыялекталогіі, лінгвадыдактыкі. Падрыхтавала … кандыдатаў навук.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Літ.*: Анна Михайловна Мезенко: с любовью к родному слову: биобиблиогр. указ. Витебск, 2002; Мезенко А.М. Имя внутригородского объекта в истории. Об урбанонимах Беларуси XIV – нач. XX в. Мн., 2003; *Яе ж*. Віцебшчына ў назвах вуліц: манагр.: у 2 ч. Віцебск, 2008; *Яе ж* (у суаўт.) Генетика: энциклопедический словарь. Мн., 2011; *Яе ж.* Беларуская анамастыка. Мн., 1997; *Яе ж* (у суаўт.). Беларуская антрапанімія. Віцебск,

2009. *Яе ж* (у суаўт.). Белорусская ономастика. Топонимия. Мн., 2012; *Ее же* (в соавт.). Антропонимное пространство Витебщины: моногр. Витебск, 2013.

*Д.В.Дзятко*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ